# Прыкладныя кантрольныя работы

## Беларуская мова

### *Для школ з беларускай мовай навучання*

**І КЛАС**

**Кантрольнае спісванне**

**Вясна**

Наступіла вясна. Прыгрэла яркае сонейка. Пацяклі вясёлыя ручайкі. Дрэвы і кусты зазелянелі. Заспявалі птушкі. (15 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Імяніны**

У Святланкі сёння імяніны. Ёй споўнілася шэсць гадкоў. Разам з мамай яна рыхтуе святочны стол. Хутка прыйдуць госці. (19 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

**Градка**

У Аліны ёсць свая градка. На ёй расце морква. Яе дзяўчынка пасадзіла сама. Аліне дапамагала мама. Яна ўскапала градку. (20 слоў)

**Летам**

Неба было чыстае. Моцна пякло сонца. Мы прыехалі на луг. Тут пахла травой. У траве стракаталі конікі. (18 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**ІІ КЛАС**

**Дыктанты**

**Перад навальніцай**

Стаяла ціхая раніца. Раптам узняўся вецер. Ён пагнаў па небе цёмныя дажджавыя хмары. Не стала ластавак. Пахаваліся вераб'і. Зашыліся ў кусты бэзу куры.

Успыхнула бліскавіца. Пачуўся ўдар грому. Па шыбах пабеглі зіхатлівыя струменьчыкі. (35 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Алені**

Алені пасуцца на ўзлеску. Іх рогі нагадваюць дзівосныя кветкі. Гляджу я на іх здалёк і любуюся. Блізка да іх не падыдзеш. Хутчэй за вецер бегаюць алені. Любавацца гэтымі жывёламі можна доўга. У кожным іх руху заўважаеш годнасць і далікатнасць. (40 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

**У лесе**

Андрэйка з дзядулем вярталіся з лесу. Дзядуля нёс кошык з першымі грыбамі. З кошыка выглядвалі лісічкі і маленькія падасінавікі. Андрэйка нёс літровы слоік суніц. Ён з асалодай удыхаў іх духмяны водар. Як добра ў лесе летам! (38 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

**ІІІ КЛАС**

**Дыктанты з граматычным заданнем**

**Ноч**

Ноч выдалася спакойная і цёплая. На ўзлеску ціха калыхаліся вершаліны сосен. Возера было ўсыпана залатымі зоркамі. Плыў і гойдаўся на хвалях срэбны ражок месяца.

Пад зорным чэрвеньскім небам сцішылася за возерам вёска. Толькі недзе каля кузні брахаў сабака. А на пагорку чалавечым голасам заходзілася сава. (46 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*І варыянт:* (пад) небам.
*ІІ варыянт:* зоркамі.

2. Падкрэсліце ў сказе дзеясловы.
*I варыянт:* Ноч выдалася спакойная і цёплая.
*II варыянт:* Толькі недзе каля кузні брахаў сабака.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* А на пагорку чалавечым голасам заходзілася сава.
*II варыянт:* На ўзлеску ціха калыхаліся вершаліны сосен.

**Вераб'і**

Вераб'і заўсёды селяцца побач з людзьмі. Гняздзяцца яны пад стрэхамі ці ў шчылінах будынкаў. Таму іх называюць дамавымі вераб'ямі. Гэта вельмі асцярожныя і кемлівыя птушкі. Акрамя таго, яны вялікія чысцёхі. Птушкі любяць купацца ў лужынах або ў пяску. Вераб'і прыносяць карысць чалавеку. Яны знішчаюць вусеняў і мноства іншых насякомых. (50 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

Паведаміць пра напісанне коскі.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* (пад) стрэхамі.
*II варыянт:* (у) пяску.
2. Вызначце лік назоўнікаў у сказе.
*I варыянт:* Вераб'і прыносяць карысць чалавеку.
*II варыянт:* Вераб'і заўсёды селяцца побач з людзьмі.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Вераб'і заўсёды селяцца побач з людзьмі.
*II варыянт:* Вераб'і прыносяць карысць чалавеку.

**Памочніца**

Дзед накляпаў касу. Касой ён накосіць сена. Карова з'есць яго і дасць малака. З малака зробяць смятану і масла. Бабуля насекла бульбу. Усыпала мукі і развяла цёплай вадой. Яна накорміць свіней. Маленькая Насцечка накорміць курэй зярняткамі. Куры знясуць яечкі.

Радуюцца дзед і баба. Памочніца ў іх з'явілася! (48 слоў)

*Паводле Б. Сачанкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* зярняткамі.
*II варыянт:* маленькая.
2. Падкрэсліце названыя часціны мовы.
*I варыянт* — дзеясловы: Карова з'есць яго і дасць малака.
*II варыянт* — назоўнікі: Касой ён накосіць сена.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Дзед накляпаў касу.
*II варыянт:* Бабуля насекла бульбу.

## IV КЛАС

### Дыктанты з граматычным заданнем

**Вожыкі**

Юлька зазірнула ў кошык і запляскала ў далоні. Там ляжала пяць калючых клубочкаў. Адзін вялікі і чатыры маленькія. Гэта былі вожыкі.

Праз колькі хвілін Юля сядзела перад вялікай патэльняй. У ёй было наліта малако. Вожычыха раскруцілася, пачала хлябтаць малако. За ёй паўтарылі дзеткі.

Гуляла з вожыкамі Юлька доўга. Потым сабрала ўсіх у кошык. Дзяўчынка вынесла іх з хаты і выпусціла. Хай бягуць куды хочуць! (65 слоў)

*Паводле Я. Пархуты.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* кошык.
*II варыянт:* дзеткі.
2. Вызначце лік, род і склон назоўнікаў у сказе.
*I варыянт:* Дзяўчынка вынесла іх з хаты і выпусціла.
*II варыянт:* Гуляла з вожыкамі Юлька доўга.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Юлька зазірнула ў кошык і запляскала ў далоні.
*II варыянт:* Дзяўчынка вынесла іх з хаты і выпусціла.

**Дапамога**

Хлопчыкі ўбачылі ў апалым лісці вавёрачку. Яна трымала ў зубах жолуд. Вавёрка скокнула на дуб. Яна схавала жолуд у дупле і зноў спусцілася. Стала мордачкай у лісці пыркацца.

Дупло было нізка над зямлёй. Алесь засунуў у яго руку. Яно прасторнае, шырокае. На самым дне ляжала жменька жалудоў. Хлопчыкі вырашылі дапамагчы вавёрцы. Яны сталі збіраць пад дубам жалуды. Хлопчыкі насыпалі поўнае дупло жалудоў.

Радасныя яны пайшлі дадому. (67 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* шырокае.
*II варыянт:* прасторнае.
2. Вызначце склон назоўнікаў у сказе.
*I варыянт:* Вавёрка скокнула на дуб.
*II варыянт:* Дупло было нізка над зямлёй.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Хлопчыкі ўбачылі ў апалым лісці вавёрачку.
*II варыянт:* На самым дне ляжала жменька жалудоў.

**Смачная вада**

Наш калодзеж стаіць пры самай вуліцы. Вада ў ім заўсёды светлая, чысценькая. Калодзеж капалі я і мой тата. Нам дапамагалі суседзі.

Цяпер каля хаты спыняюцца падарожныя і праезджыя. У гарачы дзень людзі наліваюць ваду ў біклажкі. Кожны хоча прагнаць смагу ў полі. Няма адбою і ад малых.

Чаму вада такая смачная? Мне растлумачыў тата. Вадзе не даюць застойвацца. Чым больш яе п'юць, тым яна смачнейшая. (67 слоў)

*Паводле В. Віткі.*

Патлумачыць значэнне слова *біклажка* (невялікая драўляная ці металічная плоская пасудзіна для вады).

Паведаміць пра напісанне коскі ў апошнім сказе.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* смачная.
*II варыянт:* чысценькая.
2. Вызначце лік і склон названых часцін мовы.
*I варыянт* — прыметніка: У гарачы дзень людзі наліваюць ваду ў біклажкі.
*II варыянт* — назоўніка: Вадзе не даюць застойвацца.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Наш калодзеж стаіць пры самай вуліцы.
*II варыянт:* У гарачы дзень людзі наліваюць ваду ў біклажкі.

## *Для школ з рускай мовай навучання*

### II КЛАС

**Кантрольнае спісванне**

**Бярозавы сок**

На бярозе сядзіць дзяцел. Ён праб'е дзюбкай дзірачку і п'е сок. Тут і мурашкі адна за адной паўзуць. Яны таксама хочуць паласавацца сокам. (25 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Лепшыя грыбнікі**

З лясных жыхароў самыя лепшыя грыбнікі — вавёркі. Яны чапляюць грыбы на галінкі. Сушаць іх на сонцы. Потым вавёркі пераносяць грыбы ў дуплы дрэў. (25 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

**Вясной**

Вясна набірала сілу. Прыгравала сонейка. З поўдня вярнуліся шпакі. Зазеленела першая траўка. Пабеглі ручайкі. Петрык і Віталь пускаюць папяровыя караблікі. (21 слова)

*Паводле М. Пазнякова.*

**Санітар**

Мы з братам знайшлі вожыка. Ён стаў сваім у нашай сям'і. Мы яго кармілі і даглядалі. Вожык пачаў лавіць мышэй. Мы празвалі яго Санітарам. (25 слоў)

*Паводле А. Жураўлёва.*

### III КЛАС

**Дыктанты з граматычным заданнем**

**Вясна**

Наступіла вясна. Ярка свеціць сонца. Снегу ўжо не відаць. Залацістымі зорачкамі расцвіў падбел.

На бярозе весела звіняць сінічкі. На старой алешыне грукае дзяцел. Над сажалкаю кружаць буслы.

Зайка белы кажушок на шэрую світку памяняў. Ён скубе траўку пад кусцікам. (40 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* кажушок.
*II варыянт:* траўку.
2. Вызначце лік назоўнікаў.
*I варыянт:* Над сажалкаю кружаць буслы.
*II варыянт:* На бярозе весела звіняць сінічкі.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* На бярозе весела звіняць сінічкі.
*II варыянт:* На старой алешыне грукае дзяцел.

**Жаўрукі**

Жаўрукі вяртаюцца з выраю ў пачатку сакавіка. Сонца ўжо ярка свеціць. Але ў лясочку яшчэ ляжыць снег. Ноччу і раніцай шчыпаецца мароз. А жаўрукі радасна звіняць над лугамі і палеткамі. Яны вітаюць надыход вясны. (35 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* (над) лугамі.
   *II варыянт:* раніцай.
2. Вызначце час дзеяслова.
   *I варыянт:* Сонца ўжо ярка свеціць.
   *II варыянт:* Але ў лясочку яшчэ ляжыць снег.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Жаўрукі вяртаюцца з выраю ў пачатку сакавіка.
   *II варыянт:* А жаўрукі радасна звіняць над лугамі і палеткамі.

**Шпачынае гняздо**

У старым парку раслі ліпы. У дупле адной з іх пасялілася шпачыная сям'я. Вадзік любіў слухаць птушыныя песні.

Аднойчы хлопчык вяртаўся са школы праз парк. У гэты час спілоўвалі дрэвы. Хлопчык папрасіў пакінуць ліпу са шпачыным гняздом. (39 слоў)

*Паводле М. Пазнякова.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* шпачыная.
   *II варыянт:* птушыныя.
2. Вызначце род і лік прыметніка ў сказе.
   *I варыянт:* У старым парку раслі ліпы.
   *II варыянт:* Вадзік любіў слухаць птушыныя песні.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Аднойчы хлопчык вяртаўся са школы праз парк.
   *II варыянт:* У старым парку раслі ліпы.

## IV КЛАС

### Дыктанты з граматычным заданнем

**Філя**

Каля сцежкі Насця знайшла маленькую птушачку. Гэта было птушаня шэрай савы. Дзяўчынка забрала птушаня <u>дадому</u>. Яна назвала яго Філя. Птушаня засталося жыць у Насці. Дзяўчынка карміла яго, мяняла ваду, чысціла клетку.

Летам Насця паехала ў вёску да бабулі. Філю ўзяла з сабой. Бацька аднёс Філю ў сад. З той пары ён жыў у садзе. (55 слоў)

*Паводле А. Вашчанкі.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* птушачку.
   *II варыянт:* птушаня.
2. Вызначце склон прыметніка ў сказе.
   *I варыянт:* Каля сцежкі Насця знайшла маленькую птушачку.
   *II варыянт:* Гэта было птушаня шэрай савы.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Летам Насця паехала ў вёску да бабулі.
   *II варыянт:* Каля сцежкі Насця знайшла маленькую птушачку.

**У чэрвені**

Свеціць яркае сонейка. Пачынаецца новы летні дзень. Дзівоснымі самацветамі ўспыхвае раса. Не злічыць на лузе красак. Побач з усмешлівымі рамонкамі растуць блакітныя званочкі. Раскашуе дзікая канюшына. Цвітуць чырвоныя лугавыя васількі. Зумкаюць пчолы. Пырхаюць матылі. Ад салодкага паху кружыцца галава.

Абапал палявой дарогі сінімі кропелькамі рассыпаны васількі. Красуе жыта. У каласах пачынаюць налівацца зярняткі. (55 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* летні.
   *II варыянт:* лугавыя.
2. Вызначце лік, род і склон прыметніка ў сказе.
   *I варыянт:* Раскашуе дзікая канюшына.
   *II варыянт:* Свеціць яркае сонейка.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Цвітуць чырвоныя лугавыя васількі.
   *II варыянт:* Дзівоснымі самацветамі ўспыхвае раса.

**Клапатлівы Цімошка**

Цімошка даглядаў свае сланечнікі. Аднойчы на агарод апусцілася шэрае воблака вераб'ёў. Яны паселі на галоўкі сланечнікаў. Цімошка запляскаў у далоні. Вераб'і з шумам узляцелі. Потым яны зноў паселі на сланечнікі. Вырашылі Цімошка з мамай абвязаць сланечнікі марляй. Яны сталі падобныя да дзяўчынак у хустачках. Зноў прыляцелі вераб'і. Але дастаць зярняткі яны ўжо не змаглі. (56 слоў)

*Паводле І. Муравейкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* (на) галоўкі.
   *II варыянт:* зярняткі.
2. Вызначце склон назоўнікаў у сказе.
   *I варыянт:* Цімошка даглядаў свае сланечнікі.
   *II варыянт:* Яны паселі на галоўкі сланечнікаў.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Цімошка запляскаў у далоні.
   *II варыянт:* Цімошка даглядаў свае сланечнікі.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ імя Максіма Танка.

*На дыску — тэксты для спісвання.*